Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА

Памятай аб сем'ях палітзьняволеных капіталістычных турмаў.

№ 5
САКАВІК
1929 г.

Инв. 1953 г. БА 828.

Что делается в Афганистане.

Трудящихся Советского Союза в последнее время интересуют события в Афганистане. Что же происходит в этой стране и почему нас должны интересовать эти события?

Афганистан—государство, которое граничит с СССР и Индией—английской колонией. Семьдесят процентов населения занимается земледелием. Над этой основной массой крестьян господствует небольшой слой помещиков и духовенства, которые вместе с государством владеют 15—20 проц. всей годной к обработке земельной площади. А надо отметить, что Афганистан—гористая страна, и удобной к обработке земли на каждые 100 десятин всего 2 десятины.

Промышленность почти совершенно не развита. Рабочих насчитывается всего около 6 тысяч, живут они в столице Афганистана—Кабуле.

Афганистан—королевство, во главе которого стоит падишах. До 1919 года правительство Афганистана, подкупаемое Англией, было послушным орудием в ее руках и проводило нужную ей политику.

В 1919 г. падишахом, после переворота и убийства старого короля, стал Аманулла. Аманулла является ставленником тех слоев Афганистана, которые не хотят, чтобы эта страна была зависимой от Англии, а была бы самостоятельной. Аманулла—сторонник дружбы Афганистана с СССР. С 1919 г. Афганистан начинает постепенно приобщаться к технике и культуре Европы: открываются новые школы для юношей и женщин (до того времени все воспитание молодежи было в руках духовенства). Устанавливается единый государственный суд по определенным законам. До этого времени суд был в руках духовенства и феодалов, которые судили, как им вздумается. Каждое племя имело свой суд. Аманулла всячески развивает промышленность.

Но все эти реформы потребовали увеличения расходов; увеличилось обложение крестьянства, которое живет в тяжелых условиях и эксплуатируется помещиками и духовенством. Недовольством крестьян воспользовались враги нового Афганистана—духовенство, феодалы и Англия. Англии вообще не на руку стремление народов к независимости и культуре, к освобождению от старого отжившего мира. Англия особенно возненавидела Афганистан и его дружбу с СССР. Независимый Афганистан очень опасен для соседней закабаленной Индии, которая, чего добраго, также будет стремиться к освобождению от власти Англии.

Затем нужно отметить, что Англии выгодно, чтобы Афганистан был врагом СССР.

Отдельные племена Афганистана, подстрекаемые духовенством и помещиками, которые потеряли свои привилегии, подстрекаемые также и Англией—подняли восстание. Аманулла принужден был отказаться от престола. Кабул—столица Афганистана—была занята бандитом Бача Сакао. Но старый падишах не сдался. Сейчас внутри Афганистана происходит гражданская война. Пока неизвестно, кто выйдет победителем. Дело решат крестьяне. Если падишах Аманулла возмет линию на улучшение положения крестьян, то тогда он будет иметь их помощниками в борьбе с феодалами и духовенством.

Мы же—СССР—заинтересованы в том, чтобы Афганистан был независимым, так как мы вообще за свободу угнетенных народов. Мы заинтересованы в том, чтобы Афганистаном руководили люди, живущие в дружбе с нами, которые не поддадутся на провокацию Англии—быть помощниками в подготовляемой Англией войне против СССР.

Р.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА.

Савініч. Друкаваць ня будзем. Пішыце, што зроблена дэлегаткамі ў практычнай працы.

Дудзіч. Друкаваць ня будзем. Пішыце аб вашай працы практычнай, як сябра ЦВК.

Асіповіч. Пішыце аб працы жанчын у вашым клюбе. Допіс друкаваць ня будзем.

Янот. Допіс скарыстован ня будзе. Пішыце, што робяць вашы актывісткі.

Беніну, Пшчкіну П., Палужу С., Ладнаму, Ахраменка П., Жалейка В., Шуті, Захараву Ф., Альшавіку А. Вершы друкаваць ня будзем,—распрацованы слаба.

Жыгалка. У адным допісу вы закранаеце надта многа пытаньняў, а таму галоўнае губляецца. Пішыце аб адным моманце, тады будзе больш выразна. Частка матар'ялу выкарыстаем.

Беларусаву. Пішыце ваш дакладны адрас. Ананімак мы ня друкуем.

Сяргееву. Пішыце, як дэлегаткі змагаюцца з тым, каб муж не перашкаджаў грамадзкай працы.

Кацнельсон Ц. Агульныя разважаньні. Пішыце аб працы дэлегацкага сходу, аб ліквідацыі няпісьменнасьці, аб ходзе культурна-бытавога паходу, які пачынаецца з 8-га сакавіка. Пішаце вы каротка—гэта добра.

Простак. Ня пойдзе. Пішыце аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

М. Роза. Верш друкаваць ня будзем. Пішыце лепш допісы.

Гольдбот. Ня пойдзе. Напішыце аб гэтым у насьценную газэту.

Тромпель. Друкаваць ня будзем. Вы пішаце пра работу аднэй асобы, а трэба пісаць аб выніках працы, які ў вас маецца актыў, што ён робіць.

Папраўка:

На першай старонцы вокладкі 4-га нумару нашай часопісі памылкова напісана: „№ 4 студзень месяц". Трэба чытаць: „№ 4—люты месяц".

Як у вас???

Хто адгадае—чаму ў Самахвалавіцкім раёне паднялася падпіска на „Белрабсялянку"?

....**Згрупавалі актыў, праводзяць колектыўныя чыткі,—правялі раённую нараду чытачак. Вынікі—250 доўгатэрміновых падпісчыкаў.**

Хто такая Кулікоўская Ліда?

— Упаўнаважаны „Белрабсялянкі", якая **добра распаўсюджвае часопісь і праводзіць чыткі ў сябе ў мястэчку Чарэі—падпісаўся ўвесь дэлегацкі сход.**

Адгадайце, што робяць другія дэлегацкія сходы Чарэйскага раёну?

Чакаем разгадкі ў наступным нумару.

Ці ведаеце, што? Мусіць, не.

Дык во, паслухайце:—добра зрабіла **Сычкаўская ячэйка Бабруйскага раёну.**

Чаму? Яна **завербавала 42 доўгатэрміновых падпісчыкаў на „Белрабсялянку".**

А як астатнія ячэйкі? Няхай яны нам адкажуць.

У Слаўным ёсьць і слаўныя пачынаньні. **Дэлегаткі выпісалі 16 нумароў „Белрабсялянка".**

І гэта ўсё?

Не. **Спадзяемся, што яны паднімуць падпіску да 100.**

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

Адрас рэдакцыі:
Менск, Савецкая вул., № 45.
Тэлефон № 419.

ОРГАН АДДЗЕЛУ РАБОТНІЦ І СЯЛЯНАК ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ КОМУНІСТ. ПАРТЫІ (бальш.) БЕЛАРУСІ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
На 1 месяц . . . 15 кап.
„ 3 „ . . . . 45 „
„ 6 „ . . . . 90 „
На год . . . 1 р. 80 „

№ 5 (55) | Сакавік (март) 1929 г. | № 5 (55)

Жанчына ў МОПР!

58 год таму назад рабочыя Парыжу зрабілі першую спробу ажыццявіць дыктатуру пралетарыяту, і, ня гледзячы на нябывалы гэраізм, які выказалі парыскія камунары ў сваёй барацьбе, яны ўсё-ж такі палі. Звыш ста тысяч лепшых сыноў рабочае клясы загінула ў тыя крывавыя дні на вуліцах Парыжу. А колькі там было жанчын і дзяцей! Няма падліку.

З таго часу прайшло некалькі дзесяткаў год. За гэты час барацьба пролетарыяту і прыгнечаных, падняволеных народаў ва ўсім сьвеце ня толькі ня спынялася, але-ж узмацоўвалася і абвастралася. У выніках гэтае барацьбы і выбухла Кастрычніцкая Рэвалюцыя ў 1917 годзе, якая ўтварыла нашу Савецкую Камуну, якая існуе ўжо 12-ы год. Нашу **Рэспубліку Саветаў не змагла перамагчы ніякая дзікая сіла, бо наша Савецкая Камуна мае на сваім баку рабочую клясу і прыгнечаныя масы ва ўсім сьвеце**, у той час, калі Парыская Камуна ня мела належнай падтрымкі ні з боку рабочых іншых краін, ні з боку французскага сялянства. Тутака сіла міжнароднай пралетарскай салідарнасьці мацней усяго на сьвеце.

Рабочая кляса ў барацьбе сваёй супроць капіталістычнага ладу, апрача таго, выкавала сабе моцную масавую арганізацыю дапамогі барацьбітом рэвалюцыі—МОПР. З таго часу, як была задушана Парыская Камуна, міжнародная буржуазія не адзін раз патапляла паўстаньні працоўных мас у іх уласнай крыві. Шалёны тэрор, які разгортвае сучасная буржуазія супроць рабочых і сялянскіх мас, ня ведае канца: просты і тупы кінжал, якія здымаюць голаву рэвалюцыянэрам у Кітаі, жалезныя каморкі ў Італіі, электрычнае крэсла ў Амэрыцы, турмы, катарга, катаваньні лепшых сыноў рабочае клясы і рэвалюцыйнага сялянства ва ўсім сьвеце,— вось да чаго дайшла сучасная „культурная“ буржуазія. Паўсюды няшчадна зьнішчаюцца жывыя сілы рэвалюцыі, не застанаўліваючыся ні перад якімі зьдзекамі, ні перад якімі гвалтаваньнямі.

Дзеля таго, каб мець хоць некаторае прадстаўленьне аб буржуазным тэрору над рэвалюцыянэрамі, мы тут прывядзем некалькі фактаў. Вось аб чым паведамляюць з Кітаю: „у гэтыя дні (сьнежань, м-ц 1927 г.) на вуліцах Кантону падбіралі маладых дзяўчат, якіх расстрэльвалі. Групу ў 50 чал. дзяўчат завярнулі ў хлапок, аблілі бэнзінам і падпалілі“.

Вось што піша з турмы фашысцкай Літвы нейкая Ганна Шмэйгоўская: „Уначы мяне ўвялі ў габінэт начальніка палітычнай паліцыі. Сядзеўшыя за сталом начальніка пачалі задаваць мне пытаньні. Не пасьпела я пачаць гаварыць, як ззаду мяне ўдарылі па патыліцы так моцна, што я адразу ўпала на падлогу і самлела. Мяне сталі аблівать вадой, і калі я прышла ў сябе, мяне пачалі лаяць за тое, што я ўпала. Потым сталі гвалтоўна разьдзяваць. Разьдзеўшы, мяне павалілі голай на падлогу, пачалі біць да таго часу, пакуль я спыніла крычаць. Што далей было са мною я ўжо ня памятую“.

Яшчэ адна вестачка з Кітаю: „583 сялян з вёскі Іза-Лі былі забіты. Жанчын перад сьмерцю гвалтавалі і выразалі ім грудзі“.

Гэтак і яшчэ іншыя формы тэрору сыстэматычна праводзяцца ва ўсіх буржуазных краінах, дзе ў сучасны момант знаходзяцца за жалезнымі кратамі звыш 115.000 палітзьняволеных.

Вось чаму мы заклікаем усіх працоўных жанчын гораду і вёскі: **„Уступайце ўсе ў МОПР, дапамагайце зарубежным барацьбітом рэвалюцыі“.**

Кожная наша мопраўская капейка, кожны наш мопраўскі ліст, якія атрымоўваюць з краіны Саветаў палітзьняволеныя, улівае ў іх бадзёрасьць і новыя надзеі.

Вось што пісала адна жаночая група палітзьняволеных з Рэвельскай турмы: „Здавалася, што дні і ночы сталі карацей, калі мы атрымалі ад вас ліст“.

Адсюль досыць зразумела кожнаму з нас, што дапамога зарубежным барацьбітом рэвалюцыі, якія папалі ў палон буржуазеі і фашызму, павінна быць першым нашым абавязкам.

Успамінаючы слаўных парыскіх камунараў, якія загінулі ад зладзейскіх рук Тьера, Галіфэ і іншых французскіх генэралаў за свабоду рабочае клясы, узмацнім нашу братэрскую дапамогу тым нашым братом, якія доўгія гады пакутуюць у засьценках капіталістычнай катаргі.

Няхай пагэтаму ў дзень 18-га сакавіка не застанецца ніводнай работніцы, ніводнай працоўнай сялянкі, якая ня ўступіць у рады МОПР'у. Цераз МОПР, разам з працоўнымі масамі ўсяго сьвету, будзем дапамагаць рабочым і сялянам капіталістычных краін перамагчы буржуазны сьвет уціску і няволі, сьвет крыві і слёз.

М. Калмык.



Стихи польского поэта Ст. Станде.

Грузное небо все ниже, все гуще, все жестче.
Люди то шли, то бежали, то вновь исчезали на срок.

Узкая уличка еле прорвалась на площадь.
Город, гудя и стеная, в предчувствии бед, изнемог.

Раскалывал камни клекочущий цокот подков.
Как зубья тупые, блестели концы у штыков.
Кучки людзей на углах собирались в молчаньи.
Что-то шептал, задыхаясь, шифрованный голос депеш.

Красные крылья вдруг взвились у толп за плечами.
Бросились толпы на площадь, шагнув за суровый рубеж.

Раскалывал камни клекочущий цокот подков.
Как зубья тупые, блестели концы у штыков.

Кто-то вознесшийся воздух рукой перерезал,
Смял тишину и опутал всех речью своей.
Сердце—как факел! А воля и руки—железо!
Черная площадь,—о, площадь!—вздымалась бурливей морей.

Раскалывал камни клекочущий цокот подков.
Как зубья тупые, блестели концы у штыков.
Кучки людзей на углах собирались в молчаньи.
Что-то шептал, задыхаясь, шифрованный голос депеш.

Грохнула песней могучая туча рубах.
Удар за ударом отстукивал цокот подков.
И лязгнули грозно железные зубы штыков.
Раненой стаей летали вспорхнувшие птицы.
— Братья! Ни с места! Бежавший от битвы—неправ.

Толпы упрямые в землю сумели вцепиться,
Разворотив мостовую и камни в ладони зажав.
Галопом, галопом испытанный топот подков!
Вгрызаются в мясо железные зубы штыков.
Грузное небо все ниже, все гуще, все жестче.

Прятались люди за плечи домов и колонн.
Пятнами крови зарделась широкая площадь.
Несся из города тяжкий подавленный стон.
Раскалывал камни клекочущий цокот подков.
Как зубья тупые, блестели концы у штыков.

Перевел с польского **А. Безыменский.**

Ад в тюрьме „Лукишки".

„Вот щелкнул за нами замок тюремной калитки, глухим эхом отозвался стук этот у меня в сердце",—пишет один из политзаключенных в тюрьме „Лукишки" (Польша).

Нас отвели в баню, раздели донага, очень тщательно обыскали наше платье и даже заглянули в рот...

Затем нас в числе 5 человек поместили в камеру, предназначавшуюся когда-то царским правительством для одного человека. Камера имеет вид продолговатого квадрата длиною в пять с половиною шагов, шириною в три шага и высотою не более одной сажени. Окно в один квадратный аршин было расположено выше роста даже очень высокого человека. При этом лазить на окно строго воспрещалось. Кровать, днем прикрепляющаяся к стене, столик (при переводе на карцерное положение также откидывается к стене) и в углу неизменная „параша",—вот та обстановка, в которой долгие годы должны жить трое, а то и пять человек. Спим мы на рваном тощем тюфяке с полуистлевшей соломой, так что приходится подстилать вниз свое платье. Зимой тюрьма отапливается очень плохо, а с 1-го апреля отопление и совсем прекращается. От постоянной сырости и холода мы все больны.

Нам мало что разрешается кроме ежедневной прогулки и права писать по одному письму в месяц к своим родным. Зато запрещается нам очень многое. Мы не имеем права ни громко говорить в тюрьме, ни свистать, ни петь, ни перестукиваться, ни глядеть в окна, ни кланяться товарищам на прогулке, ни беседовать с ними. Трудно даже перечислить всё то, что запрещается нам тюремным регламентом. И за малейшее нарушение его нас сажают в карцер, лишают писем, свиданий, прогулок".

ЖАНКІ НА ПЕРАВЫБАРАХ.

Перавыбары сельскіх саветаў закончаны. У новы склад саветаў абрана шмат батрачак і сялянак. У гарадзкія саветы абіраюцца работніцы і хатнія працаўніцы. Дзесяткі пісем атрымала „Беларуская Работніца і Сялянка“ ад нашых рабселькорак. І пішуць яны, як батрачкі і сялянкі-бяднячкі сумесна з сераднячкамі адваёўвалі жаночыя правы—праводзілі сваіх кандыдатаў у саветы.

З „Комінтэрну“ ішла дапамога.

Перавыбары надыходзілі. З фабрык і заводаў паехалі ў вёску рабочыя брыгады.

Заскрыпелі палазы, і ў позныя месячныя вечары далёка чуўся шум хурманак і скрып намерзшых аглабель. У падшэфныя вёскі ехалі шэфы, сьпяшаліся на перавыбары.

У адзін з такіх зімовых вечароў ехала рабочая брыгада ў *Рымавіцкі сельсавет, Бабруйскай акругі.* Гэта былі работніцы і рабочыя з шкляной гуты „Комінтэрн“. Яны ехалі ў вёску дапамагаць беднаце абіраць свой новы савет.

— У Рымавіцкім сельсавеце,—піша работніца З.,—было праведзена 12 сходаў жанчын і адна конфэрэнцыя. Добра праведзеная падрыхтоўчая праца апраўдала сябе на перавыбарах. Мы бачылі вялікую актыўнасьць сялянак на выбарчых сходах. На кожным сходзе было да палавіны жанчын. Трэцяя частка сябраў сельсавету—жанчыны. Намесьнікам старшыні сельсавету абрана сялянка.

У Рагачоўскім раёне у вёсках было праведзена 49 сходаў,—піша наша селькорка Фінкельштэйн.—Аб перавыбарах загадзя было расталкавана кожнай дэлегатцы. Праводзілі нават спэцыяльную раённую нараду грамадчыц. А ў горадзе Рагачове на сходзе дэлегатак была вынесена новая прапанова:

— Кожная дэлегатка павінна прывесьці на перавыбары гарсавету 5 неарганізаваных жанчын.

Яслі выручалі.

Ня кожная сялянка і ня ўсякая работніца магла сьмела ісьці на перавыбары. Дома заставаліся малыя дзеці. З сабой іх ня возьмеш на сход. Што рабіць?

— Па нашых хутарох і пасёлках Маладнёва жыве шмат адзіноты,—піша М. Р., сялянка вёскі *Роўнапольле, Сьмілавіцкага раёну.*—Дома толькі мужык з жонкаю ды малыя дзеці. Каго ім пакінуць у хаце, каб пайсьці на перавыбары?

І выхад быў знойдзены. Сёлета шмат якіх жанчын выручалі часовыя яслі. Гэтыя яслі наладжваліся толькі на час перавыбараў—на дзень, два.

Вось што піша пра арганізацыю часовых ясьляў наша селькорка *В. Жураўлёва:*

— У нас у *Гарадоцкім раёне, Віцебскай акругі,* сёлета ў першы раз практыкавалі адчыненьне часовых ясьляў. Маткі зносілі ў яслі сваіх дзяцей, а самі спакойна йшлі на перавыбары. Яслі былі адчынены ў двух сельсаветах. Дзякуючы гэтым ясьлям, з кожных 100 сялянак ня менш 75 было на перавыбарах.

У арганізацыі часовых ясьляў у *Гарадоцкім раёне* дапамагла мясцовая каапэрацыя. Што-ж зрабіла каапэрацыя другіх раёнаў? Будзем спадзявацца, што гэты новы вопыт знойдзе жывы водгук у нашай вясковай грамадзкасьці. І тады жанчыны будуць часьцей хадзіць на сходы і ня будуць калечыць дзяцей, пакідаючы іх на 5-гадовых дзяўчатак і „падросткаў“.

На сходзе. Марозьку бярудь у работу.

Клясавая сьвядомасьць жанчын-незаможніц, сьмелая крытыка работы кулакоў і іхных падпявалаў—вось што кідалася ў вочы на многіх перавыбарах. Батрачкі і бяднячкі сьмела выкрывалі ўсе махінацыі „бывалых баб“—жанок багатыроў.

Адзін з такіх сходаў на Мазыршчыне апісвае наша селькорка *Хількевіч С.*

9 студзеня ў Петрыкаўскім раёне, у вёсцы Сьнядзім, былі праведзены два перавыбарчыя сходы: адзін—мужчын, другі—жанчын. Праз дзень у райвыканком прышла заява з просьбаю адмяніць перавыбары. На заяве 24 подпісы. На 13 студзеня былі назначаны паўторныя перавыбары. На сход прыехаў і жанарганізатар. Яшчэ сход не адчыніўся, а ўжо чулася, што ўсёй грамадой верхаводзіць Наталка Марозька (дачка пазбаўленага выбарчых правоў). Абіраюць прэзыдыум.

Усе крычаць:

— Марозьку Наталку! Марозьку!

— Відаць, аўторытэтная бабка, талкуюць прадстаўнікі з райвыканкому, можна абраць.

Абсталёўваюць куток „Савецкага будаўніцтва“.

Аж вось падымаецца з лавы бяднячка і просіць слова.

— Сёньня Марозька цэлы дзень хадзіла па сялу і зьбірала подпісы тых, хто будзе за яе галасаваць. Нельга нам абіраць Марозьку!

Раптам усё загуло. Абаронцы Марозькі заварушыліся. Тады ўстае яшчэ адна бяднячка і просіць:

— Прачытайце заяву і хто падпісаўся на ёй?

Прэзыдыум агалашае заяву. Падымаецца шэсьць рук.

— Я не падпісвала!

— І я не! Марозька адна падала заяву, сама ўпісала нашы прозьвішчы!

І ўзяліся бяднячкі выкрываць усе махінацыі сьнядзімскіх кулакоў. А калі пачалі галасаваць, 68 рук паднялося за тое, што ранейшыя перавыбары былі праведзены правільна.

— Гэта пралаза Марозька хацела сарваць іх!

Перамога была на баку бяднячак. У сельсавет прайшлі тыя жанкі, якіх і раней раіла ячэйка і сход беднаты. Замеры Марозькі былі выкрыты.

Голас жанчын.

Шмат чаго новага ўносілі сялянкі ў наказ у час сёлетніх перавыбараў. Жанкі вёскі *Варонічы* (Бігосаўскі сельсавет, Дрысенскі раён), адбіваючы моцны націск тамтэйшых кулакоў, заявілі:

— Што-б там ні было, а адчыненьня ясьляў мы будзем дамагацца!

Сялянкі вёскі *Лучын* (Рагачэўскі раён) заяўлялі:

— Удаве цяжка дастаць дроў з лесу. Туг патрэбна большая



Лукашонак Вера—сябра Самахвалав. с/с.

дапамога камітэтаў. Хуліганаў і злодзеяў мала караюць. Яны наводзяць страх у вёсцы.

А сялянкі вёскі *Курганы* заявілі:

— Нашы дзеці-вучні сядзяць бяз кніжкак. Мы ня можам абысьціся бяз чырвонага кутка, для жанчын патрэбны лікпункт.

Сялянкі дапамагалі выяўляць і хібы ў працы коопэрацыі. Бяднячкі вёскі *Лучын* вось што выявілі:

— Да поўнага паю нехватае 75 капеек, дык з крамы ні на паўрубля тавару не дадуць.

Вельмі цікавую і карысную прапанову ўнесла 85-гадовая сялянка *Кандратава* з вёскі *Езяры, Загаранскага сельсавету, Круглянскага раёну*. Яна заявіла:

— У нас шмат пустых цэркваў. Трэба скарыстаць іх на больніцы альбо на школы. А ёсьць школа, дык арганізуем ткацкую арцель. Няхай лепш стаяць у царкве ткацкія станкі і абляг-чаюць цяжкую працу жанчыны.

Жанчыны вёскі *Роўнапольле, Сьмілавіцкага раёну*, дапамаглі правесьці самаабкладаньне на 3 будучыя гады і гэтым самым дабіліся таго, што будуць мець новую школу.

Сялянкі ў саветы.

— А калі выбіралі жанчын у *Крываносаўскі сельсавет*,—піша селькорка *Панамарова*,—кулакі рукамі і нагамі адмахваліся.

— Ня трэба нам гэтага бабскага засільля!

Толькі дзякуючы організаванасьці жанчын і дапамозе беднаты ў сельсавет прайшло 9 незаможных сялянак і батрачак.

А. М.

Противоалкогольный уголок в клубе.

Тав. Крупская сярод дэлегатаў VIII зьезду ЛКСМ.

27-го февраля исполнилось 60 лет Н. А. Крупской. Тов. Крупская—один из старых членов компартии, неутомимый борец за дело рабочего класса. Рука-об-руку вместе с Владимиром Ильичем оно прошла тернистый путь борьбы за осводождение рабочего класса. Тов. Крупскую горячо любят трудящиеся СССР. 60-летний ее юбилей отмечала вся партийная и советская общественность і пожелали тов. Крупской успеха в дальнейшей работе.

Будзем пісьменнымі.

Работніцы нашага саўгасу добра зразумелі, як цяжка быць непісьменнымі. Пачын зрабілі пажылыя работніцы—паступілі ў арганізаваны гурток па зьнішчэньню непісьменнасьці.

Вось некаторыя з іх: Чабатарэўская Матруна мае 45 гадоў. Яна матка чатырох дзяцей, але не прапускае ніводных заняткаў лікпункту. Старанна вучыцца і Пятухоўская Наста. Даільшчыцы Шабунеўскай Мар'і таксама 45 г. Нават маленькае дзіця ня суніме яе жаданьня вучыцца. Лапацінай Аўдоці 37 гадоў.

Прышлі гэтыя кабеты ў лікпункт зусім непісьменнымі, а зараз—ведаюць усе літары, патроху чытаюць, пішуць.

Па прыкладу старэйшых работніц, запісаліся і добра наведваюць лікпункт 23 жанчыны. Зацікаўленасьць работніц саўгасу вучобаю вельмі вялікая.

Школьнікава Т.

Саўгас Леніна, Аршанскай акр.

Вучымся і чытаем „Белрабсялянку".

Пры Забалоцкім дэлегацкім сходзе пры нардоме 2 гурткі кройкі і шыцьця. 60 жанчын, з якіх значная колькасьць сямейных, стала наведваюць заняткі гуртка. Ужо адбылося 18 заняткаў. Прапрацоўваем таксама палітычныя гутаркі.

Больш паловы сябраў гурткоў зьяўляюцца падпішчыкамі на часопісь „Беларуская работніца і сялянка". Працаю кіруе актывістка—сялянка-настаўніца. Гурткоўцы плацяць сяброўскія ўносі, якія трацяцца на паперу і інш. Зацікаўленасьць гуртком вельмі вялікая. За 3-4 вярсты з ваколічных вёсак зьбіраюцца сялянкі на заняткі. Гуртком ахоплены ўсе батрачкі вакольных вёсак.

Значная частка сябраў гуртка так вырасла за гэты час, што карыстаецца нардомаўскай бібліятэкай.

Скарабагаты.

Навучацца пісьменнасьці 602 жанчыны.

Па Жыткавіцкаму раёну існуюць усяго 38 лікпунктаў і 4 школы для малапісьменных. Вучацца пісьменнасьці — 602 жанчыны. Ахвотна ідуць у школы і ўжо немаладыя: вось, напрыклад, Атліванава — сябр РВК, вёскі Польна, 39 гадоў. Была непісьменная, а цяпер вельмі задаволена, што хутка будзе пісьменнай.

Вучні прыходзяць дамоў са школы (8—10-гадовыя) і дапамагаюць сваім маткам вучыцца. Адзін вучань, Алесь 9 гадоў, задае пытаньне сваёй маці: „Чаму ты, маці, дагэтуль была непісьменная, я малы вучань, а ўжо пісьменны".

Па гэтаму раёну ліквідуюць сваю непісьменнасьць толькі 40 дэлегатак.

Альтшулер Э.

Жыткавічы, Мазырскае акругі,
Райком КПБ.

По фабрикам и заводам.

Так ли проводят выдвижение.

Директива партии о выдвижении работниц на ответственную работу, о поднятии квалификации не всегда правильно проводится в жизнь местными организациями.

К десятой годовщине существования женотделом было выдвинуто 6 работниц. Двух девушек поставили квалифицироваться в слесарной мастерской. Обещали сохранить их прежний заработок, т. е. 40 руб. в месяц. Поработали они месяц, второй,—получили 25 руб.—ученическую ставку. Когда работницы начали требовать обещанное, мы ответили:—„Мы от заводоуправления не можем добиться прибавки". Как быть? Что делать? Оставить работу! Это значит потерять авторитет среди рабочих (нашумели много, что поставили девушек квалифицироваться). Рабочие не знают суть дела, а осудят, как невыдержанных, „что баба остается бабой". Остаться квалифицироваться, голодать. Какой же мастер выйдет,—больной—никудышный.

Время идет, материальные недостатки толкают бросать квалификацию и итти на прежнюю работу. Парт'ячейка и фабком винят работниц,— дескать, не хотели работать — квалифицироваться оставили. Кто виноват? Я думаю, что парт. коллектив, который не сговорился окончательно с администрацией.

Одна была выделена в страхагентство. Первое время была недовольна, потому что у станка она получала 60 руб., а там 40—45 руб. и трудновато было вначале разбираться в этих книгах. Она недостаточно грамотна. Теперь привыкла и справляется с работой.

Партколлективу нужно более внимательно подходить к выдвижению, подбирать кандидатуры, которые соответствовали бы работе, и тогда выдвижение даст хорошие результаты.

Лобанова Л.

Речица, ф-ка „Днепр".



Выдвиженка з хлебозавода.

Рабочие должны знать своих выдвиженок.

Постановление ЦК ВКП(б) говорит о том, что вопросы выдвижения должны широко обсуждаться рабочими. Вокруг выдвиженцев нужно создаць общественное мнение и этим помочь им справляться с работой.

У нас на фабрике дело обстоит не так. На днях работницу—Хацкевич выдвинули на работу зав. трудколлективом. Никто, кроме партколлектива и завкома, эту кандидатуру не обсуждал. Почему бы не обсудить кандидатуру Хацкевич в цеху, где она работала, и этим создать мнение о том, что мы именно выдвигаем лучших, примерных. А то ведь создается мнение, что кто-то кого-то выдвинул.

Так делать не надо.

Н.-Борисов, ф-ка „Красная Березина".

Соня Фридлянд.

От редакции: Редакция считает, что в основном т. Фридлянд права. Конечно, нужно кандидатуры выдвиженцев обсуждаць совместно с активом, на делегатском собрании, в цеху. Но если выдвигает бюро партколлектива и фабзавком, это не значит, что „где-то, кто то".

Бюро партколлектива и фабком должны побольше привлечь актив и всех рабочих к обсуждению выдвигаемых кандидатур.

Тав. рабкорки: пишите, каково отношение к выдвиженцам—рабочим и работницам, связь с ними и помощь выдвиженцам.

Кущая экономия.

В Борисовск. яслях им. „1 Мая" 25 детей рабочих и служащих. В месяц на каждого ребенка полагается по норме 24 рубля, а заведующая жалуется, что отпускают только 75 процентов этой суммы.

„Смета не утверждена", об'ясняют причину не полной выдачи.

На дрова денег хватает, топят хорошо, а в яслях дети мерзнут. Да и как не мерзнуть, когда потолок разошелся, полы погнили, в приемной такие дыры, что можно и ноги поломать.

Ремонт нужен был еще в прошлом году, но отложили из-за экономии на этот год, отпустив на это дело 2000 рублей.

Дадут ли их, это еще вопрос, а здоровью наших детей наносится ущерб. Насморки у детей и кашель—вещь обычная.

Родительский комитет в работу ясель не привлекается.

г. Борисов.

Ф.

На квалифицированную.

— Нужно не отставать от мужчин—толковали работницы хлебозавода на протяжении 5-6 лет. Эти требования были выдвинуты через стенгазету перед ячейкой и завкомом. К голосу работниц прислушались, и теперь мы имеем хорошие результаты.

Товарищи Цитрон, Данишевская, Галонская, Верумчук и другие выдвинуты на лучшую, квалифицированную работу. С пуском третьей смены бараночного цеха ожидается значительное улучшение материальных условий многих работниц, которые теперь на черной работе.

Так мы на деле проводим директивы партии о выдвижении работниц на квалифицированную работу.

Брегман.

Хлебозавод—Минск.

Работницы! пишите, как у вас обстоит дело с выдвижением работниц на руководящую и квалифицированную работу, как работают ваши выдвиженки, хорошая ли у них связь с предприятиями.

ПРА ШКОЛЬНЫЯ СПРАВЫ ЎСІМ ВЕДАЦЬ ЦІКАВА.

Дапамаглі школе.

У нашай вёсцы Бардзілоўка, Самахвалавіцкага раёну, было праведзена 3 лётарэі ў дапамогу бедным вучням. Выручылі 80 р. За гэтыя грошы набылі адзеньне і абутак бедным дзецям. Каб грошай не раскідаць за працу швачкам, то дзяўчаты, якія ў мінулым годзе навучыліся шыць у гуртку кройкі і шыцьця, парашылі сшыць вопратку для вучняў дарэмна.

Як рашылі, так і зрабілі, і на гэтым зьбераглі—20 руб.

Зараз бедныя вучні ходзяць ў вопратках і абутку ў школу, ім ёсьць магчымасьць вучыцца.

Іванoвіч Марыля.

Цемру пераможам!

Некалькі год чакалі сяляне вёскі Беразіны, Людзянеўскага с.-с., каб організавалі ў іх школу, бо ў Людзяневічы далёка хадзіць, і шмат дзяцей астаюцца невукамі. Сёлета мы маем школу; дзеці вучацца, і старыя маюць магчымасьць хоць трохі падвучыцца.

Каля 80-ці чалавек ахоплена ў лікпунце, там можна бачыць нават і барадатых ці сівых сялян альбо сялянак. Усе яны, ня гледзячы на свой узрост, ідуць за некалькі вёрст у лікпункт.

Змагаемся з бяспрытульнасьцю.

У кастрычніку разгарнула працу таварыства „Прыхільнік дзяцей". Раней мы мелі толькі 90 сябраў яго, а зараз выраслі да 160.

Праца праводзіцца выключна актывам таварыства, большасьць якога—жанчыны.

Праводзяцца абгляды, вучот паўбяспрытульных дзяцей. За кароткі тэрмін у дапамогу бяспрытульным выдадзена 57 р.

У касе таварыства маецца 104 р. Сродкі зьбіраем шляхам арганізацыі „месячнікаў" і інш.

У пяцігодзьдзе сьмерці Леніна таварыства адчыніла пакой для 5 бяспрытульных дзяцей.

В. Жураўлёва.

Гарадок, Віцебшчына.

Маткі—бліжэй да школы!

Увосень у школу запісалася многа дзяцей, а калі прышлося да заняткаў, то частка дзяцей спазьнялася ў школу, а некаторыя зусім не наведвалі яе. Дзеці на заняткі прыходзілі мурзатыя, у брудных кашулях.

Склікалі сход матак, дзе прысутнічала 100 чалавек, абгаварылі пытаньне аб выхаваньні дзяцей у школе і дома. У спрэчках выказалася 13 жанчын. Яны казалі аб тым, што патрэбна большая дысцыпліна ў школе, трэба змагацца з прагуламі, кепска, што дзеці выходзяць з школы і накідваюцца на падарожных, шыбаюцца каменьнямі. Вучні недастаткова забясьпечаны кніжкамі, вучэбнымі прыладамі. Трэба адшукаць сродкі для дапамогі дзецям беднаты і батрацтва.

Сход даў добрыя вынікі: цяпер дзеці прыходзяць у школу без спазьненьняў і больш чыстымі, дагледжанымі.

Школьнікава Т.

Леніно, Аршанскай акр.

Нельзя выполнить.

Руководителями детсада, совместно с комиссией, обследованы условия, в каких находятся воспитанники детсада у себя дома. Результаты обследования были поставлены на обсуждение родительского собрания. Воспитательницы детсада раз'яснили, какие условия для ребенка нужны дома для правильного здорового воспитания. Матери внимательно слушали доклад, но тут же перед нами встал вопрос: как быть в дальнейшем. Не пустить детей в детсад—нельзя: там детей учат, правильно воспитывают. А создать дома для детей условия, которые требует детсад, невозможно. Спать отдельно, кушать отдельно, особые полотенца, купать детей зимою — вот что рекомендовали нам. А разве мы можем выполнить все это в условиях жилищного кризиса и других недостатков.

Виленская.

Мозырь.

Примечание: Мы просим матерей высказаться—права ли т. Виленская в том, что совсем невозможно дома содержать детей в чистоте.

На саматужках.

От позорного ремесла—к трудовой жизни.

Проституция не только пережиток старого буржуазного общества, большое социальное зло, но также и источник распространения венерических заболеваний.

Поэтому штабами борьбы с проституцией являются вендиспансеры, и особенно существующие при них советы по борьбе с проституцией.

Работа этих советов заключается в лечении больных проституток и привлечении их к полезному труду. Поставить их в личшие материальные условия, приучить к труду—главная задача советов.

В мешочно-пошивочной мастерской.

В настоящее время по городам СССР при венерологических диспансерах организовываются различные мастерские, в некоторых городах есть общежития при мастерских.

В Бобруйске в прошлом году открыта мешочно-пошивочная мастерская. Большинство из работающих в этой мастерской—бывшие проститутки, лишь некоторые—матери-одиночки, брошенные мужьями, стоящие на пороге проституции.

Благодаря вниманию партийных и советских органов работа мастерской налажена хорошо. ЦРК и Окрсоюз снабжают рваными мешками для починки.

В прошлом году секция здравоохранения при Горсовете обследовала вендиспансер и мастерскую и нашла, что мастерская вполне оправдывает себя, как способ борьбы с проституцией. На нужды мастерской были Горсоветом отпущены средства.

Из всех работниц профилактической мастерской только 2-3 были уволены за то, что продолжали заниматься проституцией. Остальные работают и по сей день.

Средни заработак лучших работниц на 1-е января 1929 года равнялася 28—37 р. в месяц. 4 человека зарабатывают не выше 20 рублей. К сожалению, в последние дни есть заминка в снабжении мешками, что отражается на заработке. Предполагаем, что в ближайшее время будем работать с прежней нагрузкой.

Поразительная перемена произошла в образе жизни и взглядах прежде несчастных, торговавших собой женщин. 7 человек занимаютая в кружке по ликвидации неграмотности. Большинство обеспечено комхозом квартирами. Предполагается создать фонд для выдачи пособия временно заболевшим работницам. В настоящее время 7 работниц переводится на производство, а на их место будут приняты другие.

Привлечение проституток к труду обеспечивает их определенным заработком. Обучение определенной профессии, работа среди них—вот средство, дающее возможность больным физически и морально, измученным невзгодами жизни женщинам уйти от своего позорного ремесла к новой трудовой жизни.

Этот путь борьбы с проституцией, намеченный советской властью, единственно правильный.

Зав. диспансером **Голодец.**

г. Бобруйск.

ЗІМНЯЯ НОЧ.

Ноч на сёлы так вясёла
крыльлі апусьціла.

Ў небе чыстым і празрыстым
зорка засьвяціла.

Сьнег іскрысты, серабрысты
пырхнуў матылькамі;

лёгкай птахай ён на дахі
сьцелецца пухамі.

Зьверху грозна, аж марозна
месяц пазірае.

Пад нагамі скрып бы гамі
песьню напявае.

Ў таку ночку на лядочку
мароз барадою

тчэ дываны, вышываны,
жартуе з вадою.

* * *

З тых дзянёчкаў адна ночка
выдалась так гожа,

чары слала й ахапляла
тых, хто ў падарожжы.

І званіла-гаманіла
пад нагамі з грунту

той дзяўчыне-малайчыне,
што йшла да лікпункту.

Яе тварык убірала
чырваньню чуць колкай,

над вачыма слала іней
белаю качолкай.

... Ішла наперад сьмела, сьмела
Манька-дэлегатка,

бурнай хваляй далей, далей
па дарожцы гладкай.

І шчасьліва гаварыла,
ночка так гуляла,

ў пуці гладкім дэлегаткам
песьні падпявала.

Ахраменка.

ДЭЛЕГАТКА!

Ці ты ўжо ачысьціла сваё насеньне? А што ты зрабіла для таго, каб насеньне перачысьцілі ўсе суседкі? Ты растлумачыла ім карысьць перачысткі?



Яны ня правы.

Таварышы, некалькі заўваг аб алімэнтах. Улада вельмі добра зрабіла, калі вынесла такі закон, які абараняе права жанчыны. Што датычыцца слоў т. Студзінкава, дык ён зусім ня праў, калі кажа—„Калі дзяўчата самі круцяцца, іх трэба штрафаваць". Вось дык сказаў праўду. Аж сьмех бярэ. Ці ня першы-ж мужчына пачынае жартаваць з дзяўчынай, калі ён падыходзіць да яе і пачынае так і намякаць на сальнасьці. Што датычыцца пытаньня, што жанчына павінна гадаваць дзяцей, дык калі ёсьць сродкі для пражыцьця—і мужчына і жанчына будуць сваіх дзяцей гадаваць.

Вось словы тов. Маяка: „Хлапец вінаваты толькі тады, калі сілком прыжывае дзіцё". Ці правільна гэта.—Не. Я скажу, што якая-б дзяўчына ні была разбалаваная, і калі-б мужчына першы не закрануў яе—добра было-б. Наогул, я хачу сказаць, што таварышы зусім незнаёмы з палітыкай савецкай улады і камуністычнай партыі. Заўвагі іх адбіваюць кулацкія настроі, як напісала рэдакцыя.

Чарэя. *Сялькорка.*

Ребенок не должен страдать!

Я не согласна с товарищем Вусько, который говорит, что оба должны платить государству, а дитя воспитывать воздухом, что-ли. Это не верно. Не того мы добивались, чтобы у нас все улицы были полны беспризорными, а мы добивались, и добиваемся, чтобы беспризорность и проституцию изжить. Живут ли парень с девушкой, зарегистрированные или нет—все равно. Ребенок ни в чем не виноват.

Со стороны родителей должны быть приняты меры к тому, чтобы ребенок был обеспечен. Государство должно строить побольше ясель и площадок, чтобы женщина не была зависима от мужчины и могла участвовать в строительстве нашего государства.

Витебск. *Рудина.*

Дзяўчына—падумай!

Прачытаўшы артыкул аб алімэнтах, я скажу так: „Калі-б ня мой дурань, то і я сьмяяўся-б". Ніводная дзяўчына не права ў маіх вачох. Трэба раней падумаць—раджаць ці не, а пасьля судзіцца за алімэнты. Мы—замужнія імкнемся, каб не раджаць многа дзяцей. Зараз народ слабы, і дзеці раджаюцца слабыя. Абавязак кожнай жанчыны—падумать раней, чым стаць маткаю, падумаць над тым, ці здольна яна выхаваць здаровае моцнае дзіця.

Жанчыны, якіх пакідае муж, павінны сустрэць самыя цёплыя адносіны з боку грамады і дзяржавы. Для іх павінны быць адчынены розныя дзіцячыя ўстановы. Калі хлапец любіць дзяўчыну, яна павінна сказаць: „Ты мяне любіш, добра. Хадзем запішамся". А пасьля гэтага, калі ён не захоча жыць з ёю, ён ад дзіцяці адмовіцца ня можа. Я згодна з сялькорам Студзінкавым, Вусько і Маяком.

Мазыршчына. *Сімановіч Ф.*

У в а г а:

Рэдакцыя падкрэсьлівае, што думкі і прапановы, якія рабселькоркі выказваюць у сваіх лістох,—зьяўляюцца выключна іхнімі.

У канцы абгаварэньня рэдакцыя скажа сваё заключнае слова.

Мы предлагаем.

Прочитав коллективно в № 10 журнала статью о браке, семье и опеке, мы согласны с тем, о чем говорится в статье. Хочу сказать свое личное мнение. Я не согласна с тем, что добавляли участники читки, чтобы привлекать к ответственности мужчин, которые бросают беременную девушку и женятся на другой. По-моему—нельзя принуждать насильно жениться на девушке, которая не нравится. В содержании ребенка он, конечно, должен участвовать.

Участники читки также предлагали не брать алиментов с женатых, которые живут с девушками и вдовами. По-моему, это еще больше закабалит женщину. На содержание ребенка должен дать тот, кто является фактическим отцом ребенка.

Горулева.

Вот что мы решили.

Статью Бутара о семье и браке мы читали коллективом—25 человек. Со своей стороны мы хотим прибавить следующее:

В нашей деревне одна девушка забеременела. Она об'явила об этом той, которая собиралась замуж за отца ребенка. Наше мнение: надо привлекать к ответственности таких мужчин и заставить их жениться на обманутой девушке. Не присуждать алиментов тем девушкам и вдовам, которые живут с женатыми мужчинами.

Если муж и жена поссорятся, и жена, находясь на стороне, забеременеет от другого, то таковой в алиментах отказать.

Был у нас такой случай: один партиец женился и через 8 месяцев прогнал жену. В таких случаях надо заставить мужа платить ей за все время совместного жительства—минимум за год, чтобы она могла за это время подыскать себе работу.

Следует 23 подписи.

Касы самастрахаваньня сялянак.

Ад рэдакцыі.

Трэцяя сэсія VIII-га скліканьня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту даручыла Народнаму Камісарыяту Сацыяльнага Забясьпячэньня і Цэнтральнаму Камітэту Узаемадапамогі выпрацаваць закон аб самастрахаваньні сялянак на выпадак цяжарнасьці; прапанавана папярэдня абгаварыць праэкт закону сярод шырокіх колаў працоўнага сялянства.

Друкуючы праэкт гэтага закону ў нашай часопісі, рэдакцыя „Беларуская работніца і сялянка" запрашае дэлегатак, жаночы актыў і наогул працоўных сялянак і сялян--выказацца па гэтаму праэкту на старонках нашай часопісі.

Для чаго патрэбны касы.

Касы самастрахаваньня сялянак мяркуецца арганізаваць на асновах каляктыўнага дабраахвотнага сяброўства пры сельскіх камітэтах сялянскай узаемадапамогі. Касы маюць сваёй мэтай *дапамагаць матар'яльна цяжарным жанчынам—сябрам касы, адчыняць ясьлі для дзяцей сяброў касы, абараняць правы цяжарных жанчын, дапамагаць правядзеньню культасьветнай работы.*

Сябрамі касы самастрахаваньня могуць быць паўналетнія і маючыя выбарчыя правы грамадзяне як мужчыны, так і жанчыны. Касы ўтвараюцца па пастанове большасьці галасоў агульных сходаў грамадзян вёскі; гэтыя пастановы большасьці зьяўляюцца абавязковымі для ўсяго насельніцтва вёскі. На тэрыторыі сельсавету ўтвараецца толькі адна каса. Касамі кіруе ўпаўнаважаны, які абіраецца адзін ад кожных 50 сябраў касы. Сход упаўнаважаных абірае бюро касы ў ліку 3-х сяброў і 2 кандыдатаў, а таксама і рэвізыйную камісію.

Адкуль касы бярудь сродкі.

Сродкі касы складаюцца з уступных і сяброўскіх уносаў, грашовых і натуральных адлічэньняў, якія вылучаюцца сельскімі КСУ і іншымі дзяржаўнымі і грамадзкімі арганізацыямі. Мяркуецца ўстанавіць наступны разьмер уносаў: пры ўступленьні батрак плаціць 30 к., бядняцкая гаспадарка—50 к., серадняцкая—75 к., а больш заможная гаспадарка 1 рубель.

Сяброўскія ўносі мяркуецца ўстанавіць у суме 5 капеек з кожнага налічанага рубля падатку за год. Сход упаўнаважаных мае права аслабаніць ад выплаты ўносаў батракоў і беднату, якія ня маюць магчымасьці плаціць.

Камітэты ўзаемадапамогі таксама мяркуюць адпусьціць у фонд кас каля 50 тысяч рублёў. Такім чынам вылічана, што кожнай рожаніцы магчыма будзе выдаваць з касы па 6 руб.: да нараджэньня дзіцяці 2 р., на кармленьне яго—4 р. Матар'яльную дапамогу можа атрымаць і кожная цяжарная жанчына—сябра касы. Наогул, разьмер дапамогі ў большасьці будзе залежаць ад саміх сяброў касы, бо яны могуць папаўняць сродкі касы праз розныя крыніцы.

Усе пункты праэкту закону: ці патрэбны наогул такія касы, разьмеры ўступных і сяброўскіх узносаў, крыніцы прыбытку ў касу і іншае—патрабуюць шырокага абгаварэньня працоўных мас вёскі, асабліва жанчын. Гэты закон трэба абгаварыць на спэцыяльных сходах сялянства, на дэлегацкіх і агульных сходах сялянак, на пасяджэньнях, пленумах сельсаветаў, у хатах-чытальнях. Тэрмін абмеркаваньня—3 месяцы. Матар'ялы абгаварэньня трэба накіроўваць у раённыя выканаўчыя камітэты і ў газэты, у прыватнасьці ў часопісь „Беларуская работніца і сялянка".

Арапучык.

Пом. прокурора тов. Герчикова беседует с женщинами—общественными обвинителями.



Небывалая активность женщин всех социальных групп была в эту кампанию перевыборов советов.

По отдельным организациям были и недостатки. На собрании союзов строителей, пищевиков и транспортников женщины были не организованы, поэтому в числе 11 депутатов ни одну женщину не избрали.

В обществе кустарей было собрание женщин в одно время со сходом бедноты. Женщины на сходе не присутствовали. Получилось в итоге—женщины шли не в ногу з беднотою. На собрании женщин (присутствовало 15 ж.) зажиточные и бывшие сионистки выдвинули свои кандидатуры и ходили по хатам агитировать против кандидатур от бедноты и яч. КП(б)Б.

Все-ж собрание выбрало в депутаты всех рекомендованных беднотою и партией.

„Делегатка".

У складзе дэлегацкага сходу вёскі Лошніца 62 проц. няпісьменных. Жаданьне вучыцца ёсьць. Дзякуючы настаўніку, у хаце сялянкі зьбіраемся і вучымся. Хоць і сьмяюцца з нас, але мы робім сваю справу. Распаўсюджваем мы і часопісь „Белрабсялянка".

Да 8-га сакавіка мы паставілі сабе мэтай навербаваць 100 падпішчыкаў.

Мельнік Люба.

У Смолаўскім дэлегацкім сходзе, пад кіраўніцтвам дэлегаткі Калнін, арганізаваны 2 гурткі шыцьця і кройкі. Каапэрацыя дапамагае сродкамі і адпускае паперу для выкраек.

Гарадоцкі р-н.

Жураўлёва.

У мінулым годзе ў Самахвалавіцкім раёне амаль што ня было вылучэньня жанчын. Сёлета вылучаецца на грамадзкую працу 18—19 жанчын, сярод іх 2 батрачкі, намесьнікамі старшынь саветаў. Трэба вылучэнкам аказаць дапамогу ў іх штодзённай працы.

Слаўковіч.

Гінопальскі дэлегацкі сход Самахвалавіцкага раёну ў час перавыбараў савету паўзьняў пытаньне аб арганізацыі летніх ясьляў за кошт самаабкладаньня. Сход парашыў правесьці самаабкладаньне ў разьмеры 25 процантаў, з якіх 15 проц. адлічыць на арганізацыю дзіцячых ясьляў. Трэба, каб гэта было прыкладам для іншых дэлегацкіх сходаў.

С.

Из 5 безработных чулочниц был организован в 1925 г. трудколлектив. Теперь вместо этой маленькой кустарной мастерской у нас хорошо оборудованная фабрика, с соответствующими машинами, электро-моторами и разделением труда. В этом бюджетном году думаем расширить фабрику до 200 человек. Большинство занятых в производстве—женщины. Директор ф-ки—работница-выдвиженка. Работницы активно участвуют в производственных совещаниях и вносят дельные предложения. У нас организованы кружки, выпускается стенгазета, в которой участвуют работницы.

Гомель.

Кудрявская Ч.

От редакции: Редакция просит работниц высказаться и об отрицательных моментах, имеющих место на фабрике, как, например: некультурность, неряшливое отношение к машинам, к производству, религиозные предрассудки и пр.

Делегатское собрание поручило мне обследовать бытовые учреждения. В столовой № 2 мы выявили, что заведующий очень груб с рабочими; кроме того, он совмещает другие отрасли работы и этим занимает место другого человека, а сам монету загребает.

В инвалидной столовой № 16 была большая грязь. По нашему предложению нечистоту устранили.

В детдоме № 2 детям ежедневно выдавалось только по 8 копеек на ребенка. После нашего обследования нашлась возможность выдавать детям по 10 копеек ежедневно.

Минск.

Штейман.

Конкурс на лепшы дэлегацкі сход правяла Гомельская акруга. Адмоўныя бакі тыя, што кіраўнікі сходу кепска адносяцца да сваіх абавязкаў, нагружаны яны часьцяком іншай працай. Палескі сход, Чачэрскага раёну, арганізаваў санітарную камісію, якая зрабіла агляд усіх хат вёскі, абвясьціўшы барацьбу з грязьзю. Пасьля такога агляду сялянкі пачалі трымаць свае хаты больш чыста. Падарункі лепшым дэлегацкім сходам будуць выданы 8-га сакавіка.

Сладоўнікава.

На ст. Бигосово хорошо работает делегатка Петушкова. Несмотря на то, что у нее есть 5 детей, она находит время для общественной работы. По ее инициативе был проведен смотр красной казармы, и железнодорожные служащие проводят отчисления на улучшение жилищных условий красноармейцев. Собранные 50 рублей использованы на перевозку леса для постройки казармы. К десятилетию женотдела т. Петушкова подала заявление в партию и ячейка приняла ее.

Глушкина.

На отчетном собрании Горсовета жены рабочих ф-ки „Красный Октябрь" (Мозырь) подчеркивали плохое обслуживание медицинской помощью семей рабочих и живущих в Телепунах. Причина этого—дальность расстояния и недостаточное внимательное отношение медперсонала больницы.

Виленская.

В местечке Славном, Оршанского округа, делегатское собрание совместно со школьным советом получило в с/с 40 руб. и приобрело теплые платья, лапти, чулки для школьников—детей бедноты. Платьица, штанишки и рубашки сшила бесплатно делегатка т. Плющ.

Хороший пример заразителен. Пусть примеру по оказанию помощи школьникам последуют все делегатские собрания Белоруссии.

ПАДАТАК ЗЬНІЖАЕЦЦА ПА БЕЛАРУСІ НА 2 МІЛЬЁНЫ РУБ.

Новы закон падпісан.

20-га лютага Савецкі Ўрад падпісаў новы закон аб сельска-гаспадарчым падатку. Гэты закон дае шмат ільгот і палёгак незаможным і серадняцкім гаспадаркам.

Новы закон дае магчымасьць хутчэй узьнімаць гаспадарку і павялічыць яе прыбытак; за ўсякае палепшаньне ў гаспадарцы і павялічэньне ўраджайнасьці падатак не бярэцца, а, наадварот, яшчэ даецца скідка.

Рабоча-сялянскі ўрад дбае ў самы кароткі час дамагчыся большых ураджаяў палёў, рашучага ўздыму ўсёй сельскай гаспадаркі. Асыгнаваньні на гаспадарку ў гэтым годзе па ўсім Саюзе павялічваюцца да 600 мільёнаў рублёў, замест 300 мільёнаў у мінулым годзе. Для ўгнаеньня і засеву палёў вёсцы будзе дадзена больш мінэральных угнаеньняў і сартавога насеньня. **Арганізуецца цэлы рад новых буйных колгасаў і саўгасаў, якія дадуць дзяржаве мільёны пудоў хлеба.**

Засеўная плошча па ўсім Савецкім Саюзе мае быць павялічана на 7 мільёнаў гэктараў. Цэны на хлеб таксама павялічаны, і ў будучым годзе зьмяншацца ня будуць.

Агульная сума падатку па Савецкім Саюзе зьніжаецца на 55 мільёнаў рублёў. Для сялян Беларусі падатак зьніжаецца на 2 мільёны рублёў.

Закон дае шмат ільгот і палёгак.

35 процантаў усіх сялянскіх гаспадарак вызваляецца ад падатку поўнасьцю. Сюды ўвойдуць гаспадаркі незаможных земляробаў.

У нас у Беларусі ёсьць тысячы гэктараў розных дзірваноў і аблогаў. Шмат у каго і цяпер знойдзецца кавалак зямлі, які не распахваецца і не засяваецца, а падатак за яго браўся. Новы закон гаворыць, што калі гаспадар такую зямлю распаша і засее, дык яна два гады ня будзе абкладацца падаткам. Тут адразу дзьве выгады: і прыбытак у гаспадарцы павялічаецца і падатак зьмяншаецца.

Там, дзе падатак бярэцца не з пахаці, а з пасеву, поўнасьцю вызваляецца ад абкладаньня ўвесь прырост засеўнай плошчы ў 1929, 1930 і 1931 гадох. Напрыклад, селянін Мазырскай акругі (дзе абкладаюцца пасевы, а ня пахаць) сеяў у гэтым годзе 5 гэктараў, на лета засее 6, а праз год будзе засяваць 7. Прыбытак у гаспадарцы будзе расьці, а падатак усе тры гады будзе плаціцца толькі за 5 гэктараў.

Раней ня прыгодныя, а цяпер за сродкі саміх сялян асушаныя землі па новаму закону не абкладаюцца падаткам у працягу 3-х гадоў пасьля сканчэньня мэліорацыйных работ.

Усіх гэтых ільгот не атрымаюць адны толькі кулацкія гаспадаркі, якія абкладаюцца ў індывідуальным парадку, а не па нормах.

Ільготы старанным гаспадаром.

Новы закон дае шмат ільготаў працоўным гаспадаркам за ўсякае палепшаньне ў гаспадарцы і падвышэньне ўраджайнасьці. 10 процантаў скідкі з падатку даецца кожнай гаспадарцы тае вёскі ці зямельнага таварыства, якія засяюць палі чыстасортным ці ачышчаным насеньнем, альбо калі гаспадары зьнішчаюць межы, сеюць зялёнае ўгнаеньне, змагаюцца са шкоднікамі, рана заворваюць папар, не выпускаюць скаціну на рунь, уцяпляюць хлявы. Там, дзе гэтыя палепшаньні альбо адно з іх будуць праведзены ня ўсёй вёскай, а паасобнымі гаспадарамі, даецца 5 процантаў скідкі з падатку, і толькі тым гаспадарам, якія ўвялі гэтыя палепшаньні.

Шматдоцкія і малаядоцкія гаспадаркі атрымаюць скідку.

Гаспадаркам, якія маюць 7-8 едакоў, даецца 5 процантаў скідкі з агульнай сумы падатку. Гаспадаркам з 9—10 едакамі даецца10 процантаў скідкі. Тыя-ж гаспадаркі, у якіх налічваецца 11 і больш едакоў, атрымоўваюць 15 процантаў скідкі.

Гаспадаркам, у якіх ёсьць усяго адзін ядок, даецца 30 процантаў скідкі. Гаспадаркам з двума едакамі даецца 20 процантаў скідкі, а калі хаця адзін з гэтых едакоў непрацаздольны, тады гаспадарка атрымоўвае 30 процантаў скідкі. Але і гэтыя ільготы даюцца толькі працоўнаму сялянству. Кулацкія гаспадаркі, якія абкладаюцца ў індывідуальным парадку, гэтых ільгот пазбаўлены.

Якія яшчэ ёсьць ільготы.

Ужо цяпер шмат якія гаспадары шукаюць способаў палепшаньня свае гаспадаркі. Адны апрацоўваюць зямлю новымі палепшанымі машынамі, другія засяюць новыя культуры. Закон аб падатку і тут прыходзіць на дапамогу. Усе такія вучасткі дасьледчых пасеваў у разьмеры поўгэктара на гаспадарку поўнасьцю вызваляюцца ад падатку.

Закон аб сельска-гаспадарчым падатку патрабуе, **каб малочныя каровы тых мясцовасьцяй, дзе разьвіта масларобства, вызваляліся ад падатку напалавіну.** У такіх мясцовасьцях землі, занятыя сеянымі травамі, абкладаюцца падаткам ня вышэй, як і заліўныя сенажаці.

Зьніжаецца і абкладаньне прыбытку ад здачы ў наём сельска-гаспадарчых машын. Прыбытак ад трыераў і сартыровак не абкладаецца зусім. Для ўсіх гаспадарак, прыбытак якіх не перавышае 500 рублёў, процантавыя надбаўкі адмяняюцца.

Як і летась, пасевы траў на насеньне зусім вызваляюцца ад падатку. А засевы ільну ў раёнах прамысловага ільнаводства вызваляюцца ад падатку напалавіну. **Вялікія палёгкі дадзены калектыўным гаспадаркам і гаспадаркам чырвонаармейцаў.**

Скарыстайце палёгкі для ўздыму гаспадаркі.

Нормы даходнасьці зямлі, скаціны і сенажацяў, якія вызначаны сяголета, ня будуць мяняцца ў працягу бліжэйшых 3-х гадоў. На гэты-ж час будуць захаваны і стаўкі па падатку, якія былі прыняты ў леташнім годзе. А ўсё гэта разам дае магчымасьць гаспадару загадзя разьлічыць, падрахаваць і скласьці свой гаспадарчы плян.

Трэба, каб ужо цяпер кожная сялянка, кожны селянін ведалі, якія палёгкі па падатку яны атрымаюць за тое, што будуць пашыраць пасевы і павялічаць прыбытак сваёй гаспадаркі.

Р. А.

Гутарка агранома.

Як даглядаць за парасеньнем сьвіньні.

Калі мае цяліцца карова, парасіцца сьвіньня, сялянка павінна пільнаваць гэты час, найчасьцей заходзіць у хлеў. Калі не дагледзець за парасеньнем сьвіньні, то можа здарыцца, што матка можа падушыць і паесьці парасят, а бывае, што яны проста памёрзнуць. Калі сьвіньня паросіцца ў вялікія марозы, то парасяты хоць і не памёрзнуць, але застудзяцца і пасьля хварэюць.

Як разьлічыць час апаросу і аберагчы сьвіньню ад выкідкаў.

Час цяжарнасьці сьвіньні працягваецца ў сярэднім 3 месяцы, 3 тыдні і 3 дні. За 2—3 дні да апаросу неабходна паросную сьвіньню адлучыць ад іншых, каб яны ня штурхалі яе, бо ад гэтага бываюць выкідкі. За 3—4 дні да парасеньня ў сьвіньні вельмі набухае вымя, а гадзін за 6 можна выдаіць малако з саскоў. З гэтага часу трэба сачыць за маткаю.

Якія ўмовы неабходны сьвіньні пры парасеньні.

Перад парасеньнем сьвіньні патрэбен цёплы хлеў такі, каб чалавек бяз сьвіткі ў ім ня мёрз. Асабліва аб гэтым трэба клапаціцца тым гаспадаркам, якія зьмяняюць простую пароду на мешанцаў ці белых ангельскіх сьвіней. Культурныя сьвіньні больш кволыя і могуць хутчэй застудзіцца.

Калі ў гаспадарцы цёплага хлява няма, дык патрэбна маючыйся хлеў пацепліць. Для гэтага шчыльна затыкаюць адтуліны, праз якія дзьме вецер. Хаця б з жардзьдзя робяць столь і нацягаюць на яго саломы ці сена; у падсьцёл даюць дастаткова сухой саломы, з якой сьвіньня змайструе сабе логава.

Як дапамагчы сьвіньні і парасятам.

Звычайна апарос цягнецца ад 2-х да 6 гадзін. Патугі ў маткі пачынаюцца за 3—6 гадзін да парасеньня. Як толькі парася апаросіцца, трэба абцерці яго чыстай анучкаю ці пучком разьмятае саломы і адлучыць у скрынку ці каробку, выслaную мяккім і цёплым падсьцёлам. Зьверху скрынку трэба накрыць мяшком, каб парасятам было цяплей. Тады-ж трэба абрэзаць пупавіну, прыблізна на адзін—паўтара вяршкі ад жывата.

Парасят у скрынцы трэба занесьці ў хату, каб яны не прастылі. Няжывых парасят і пасьлед трэба адразу прыбраць. Калі ў сьвіньні вымя пасьля апаросу загрубелае, яго трэба разьмінаць і расьціраць рукамі. Бывае, што саскі залеплены гразьзю, для гэтага трэба паспрабаваць, ці ўсе саскі даюць малако.

Сьвіньні зараз пасьля парасеньня трэба даць паўвядра цеплаватае чыстае вады, дадаўшы туды жменю мукі. У гэты час у маткі вялікая смага, і яе трэба здаволіць, інакш яна можа паесьці пасьлед і няжывых парасят. Гэта звычае яе есьці і жывых парасят. Першыя 3—4 дні сьвіньню трэба карміць рэдкаю мешанінаю з мукі.

Першы догляд за парасятамі.

Праз гадзіну, калі матка супакоіцца, да яе падпускаюць парасят. Больш кволых парасят трэба падсаджваць да пярэдніх сасок,—як больш малочных, а дужэйшых—да задніх. Парасяты прывыкаюць да тых саскоў, да якіх іх падсаджвалі спачатку.

Калі матка спакойная, парасят можна і адразу пакінуць пад ёю, а калі неспакойная—трэба назіраць, каб яна не падушыла парасят.

Аб тым, як даглядаць і карміць матку і парасят, мы пагутарым у наступны раз.

Аграном **Жыркевіч Г.**



Сяляне гуртом хлеб прывезьлі.

Гутарка з дэлегаткамі

(Аб павышэньні ўраджайнасьці і падрыхтоўцы да веснавой сяўбы).

На гэты раз Ганна ўселася ў першых радах. „Хутчэй, Кацярына,—садзісь—вось ужо ідзе тав. аграном. Паслухаем, падрыхтуемся—вясна не за гарамі".

Сёньня на сход, акрамя дэлегатак, прыйшло шмат жанчын.

— Вось, тав.,—пачаў сваю гутарку аграном Лайкоў.—Я вельмі здаволен, што вы так зацікаўлены паслухаць аграномa, і хачу вас папярэдзіць, што адна гутарка, гэта толькі кропля ў моры. У нас аграномаў яшчэ мала, каб абслугоўваць сялян, як належыць, а пагэтаму трэба і з аграномам параіцца і самім пачытаць; яго не заўсёды сюды чакаюць, а і схадзіць калісь і ў бліжэйшы калгас, саўгас, раён і г. д.

Вось так мы пачнем нашу каляктыўную працу ў барацьбе за лепшы ўраджай—усімі сіламі. Вось правідловы вынік зрабіла цётка Кацярына, што „дэлегаткам трэба ў першую чаргу самім ачышчаць насеньне і правадзіць усе тыя мерапрыемствы, якія намечаны законам уряду аб сапраўдным падняцьці ўраджаю на 45 проц., і прасачыць, каб уся беднata і сераднякі нашай вёскі так зрабілі".

Інакш кажучы, кожная дэлегатка павінна стаць актыўным правадніком пастаноў уряду аб павышэньні ўраджайнасьці і першым памоцнікам аграномa на вёсцы. Пры гэтым, т. т., я хачу вас папярэдзіць, што кожны раён мае свае асаблівасьці, як, напрыклад: глеба, формы земляўпарадкаваньня і г д., а таму, акрамя таго, што мы пагутарым сёньня, як лепш вясьці сваю гаспадарку, трэба ў кожным асобным выпадку параіцца з мясцовым аграномам, які павінен казаць, як гэта прыстасаваць да мясцовых умоў.

Аб угнаеньні глебы.—Усім вам добра вядома, што нашы глебы вельмі бедныя арганічнай матэрыяў (перагноем). Каб дабіцца павялічэньня ўраджаяў, трэба больш угнойваць, а гною ў нас мала. Вось плянам Наркамзему і намячаецца пашырыць у два разы (на 100 проц.) у гэтым годзе плошчу пад люпінам на зялёнае ўгнаеньне, і для гэтага зарыхтаваць 1788 тон (107280 п.) насеньня люпіну. Трэба дамагацца, каб у кожнай вёсцы, а асабліва дзе лёгкія пескавыя глебы, пасеў люпіну павялічыўся ня менш, як у два разы супроць мінулага году, а дзе яшчэ ня сеялі, каб з гэтага году пачаць яго сеяць. Сеяць люпін можна і пад жыта і ржэўніку, зьняўшы жыта, каб папала на ўгнаеньне на будучы год пад бульбу або іншую ярыну.

Другім сродкам для палепшаньня глебы ў умовах Беларусі зьяўляецца торф; яшчэ багата балот амаль у кожнай вёсцы, але торф да гэтага часу сялянствам яшчэ шырока ня ўжываецца на ўгнаеньне глебы. У кожнай вёсцы пад носам ляжыць вялікае багацьце—золата, а мы ім не карыстаемся. Торф можна ўжываць або непасрэдна на ўгнаеньне, зрабіўшы з яго кампосныя кучкі, каб 1—1½ гады ён добра перарабіўся, або падсьцілаючы яго ў хлеў скаціне. Лепш усяго выкарыстоўваць торф, правёўшы яго праз скотны двор, бо так ён лепш разлагаецца, поўнасьцю зьбірае ў сябе гнаёвую жыжку і лятучыя часткі гною, і тым павялічваецца колькасьць і якасьць гною. Згодна закону ўраду Беларусі, намячаецца пабудаваць адзін вялікі завод і 25 дробных саматужных па вытвору тарпянае падсьцілкі. Задача-ж гэтага году наладзіць саматужны выраб падсьцілкі, каб ужо з гэтага году распачаць практычна ўжываць торф на ўгнаеньне.

Другая ўласьцівасьць нашых глеб—гэта значная забалочанасьць, кваснасьць глебы. Там, дзе на полі растуць „таўкачыкі" (хвашчы), там таксама нельга чакаць добрага ўраджаю. Такую зямлю трэба справіць шляхам вапнаваньня, каб зьнішчыць кваснасьць глебы. Урадам дан загад распачаць здабычу і перамол вапны ў гэтым годзе з такім разьлікам, каб сёлета завапнаваць 25.000 гектараў. Вызначаны сродкі для крэдытаваньня насельніцтва для набыцьця вапнавае мукі і ўстаноўлены льготныя цэны на вапну. На гектар трэба ўносіць ад 2 да 5 тон молатага вапняка або такую-ж колькасьць мэргеля.

Трэцяя ўласьцівасьць нашых глеб—гэта беднасьць спажыўнымі матар'ямі. Дзякуючы існаваньню на працягу стагодзьдзяў трохпалёвае сыстэмы, у глебе не хапае фасфарытных угнаеньняў. Вось і трэба ў дадатак да гною, люпіну і торфу, якія галоўным чынам каштоўны тым, што павялічваюць арганічную масу ў глебе і даюць азоцістую пажыву расьлінам, уносяць штучныя ўгнаеньні, як супэрфасфат, касьцяная мука, фасфарытная мука і г. д.

Плянам веснавое сяўбы намечана павялічыць завоз розных угнаеньняў на 156 проц. супроць мінулага году.

Трэба рашуча зьмяніць старую, дзедаўскую сыстэму гаспадараньня і пераходзіць да новае. Паляпшая і ўгнаівая глебу, трэба адначасова клапаціцца аб правідловым яе выкарыстоўваньні. Лепшага-ж скарыстаньня глебы і ўнасімых угнаеньняў можна дасягнуць *правільным чаргаваньнем культур, пладазьменам*, праз шматпалёвы севазварот. Правідловы севазварот будзе такі, дзе *ёсьць чаргаваньне збожавых культур з травамі* (канюшынай, вікаю) і асыпнымі культурамі (бульбаю, кораньплодамі). Напрыклад: вывозіцца гной і сеецца бульба, на другі год па бульбянішчу сеецца ярына з падсевам канюшыны, на трэці год тут будзе касіцца канюшына і восеньню засяваецца на канюшынішчы жыта, на чацьверты год будзе жыта.

Вось вам прыклад правідловага чатырохпалёвага севазвароту. Прыдумаць правідловых севазваротаў можна для кожнае гаспадаркі у залежнасьці ад глебы, колькасьці зямлі, запатрабаваньняў сям'і і г. д.

Ня трэба забываць і яшчэ адзін важны момант: аб пашырэньні тэхнічных кармавых культур. Мала завесьці правідловы пладазьмен—трэба дамагацца, каб у пладазьмене зьмяшчаліся больш каштоўныя культуры, якія даюць большы даход гаспадарцы. Такімі культурамі ў нашых умовах зьяўляюцца ў паўночна-ўсходняй частцы, на зьвязных глебах—лён, канюшына, у паўднёвай частцы—на лёгкіх глебах бульба, сэрадэля і г. д.

Плянам пасеўкампаніі намечана павялічыць плошчу пад лёнам на 12 проц., пад канаплёю на 7 проц., пад бульбаю на 10 проц., пад канюшынай на 21 проц., пад сэрадэляй на 30 проц.

Загатаўляецца адпаведная колькасьць рознага насеньня,—вось і трэба наладзіць справу так, каб на складах не засталося нескарыстаным ніводнага зярна.

Наогул трэба цьвёрда памятаць, што рашучага ўздыму ўраджайнасьці і вытворчасьці ў сельскай гаспадарцы можна дасягнуць *хутчэй у буйных калектыўных гаспадарках.* На невялічкіх кавалках зямлі, у дробных гаспадарках нельга досыць правідлова наладзіць гаспадарку, нельга поўнасьцю прымяніць усіх дасягненьняў навукі і тэхнікі.

Асабліва ўпарта павінны дабівацца арганізацыі каляктываў жанчыны, бо поўнае раскрэпашчэньне жанчыны прыдзе толькі з камунізмам. Да гэтага часу, пакуль будзе існаваць дробная і індывідуальная гаспадарка, да таго часу жанчына будзе прывязана да хатніх спраў, да печкі і гаршка.

Спадзяюся, што і мае прапановы будуць ухвалены дэлегаткамі, і жанчыны разам з аграномамі актыўна прымуцца за працу па павышэньню ўраджайнасьці і па будаўніцтву соцыялістычнае гаспадаркі.

Аграном М. Лайкоў.

Што чытаць.

	Кошт.
Бугуёў—Буракі, бручка і рэпа ў полі.	6 к.
Грабоўскі—Як і чым палепшыць насеньне	8 „
Каур—Угнаеньне кампостам . . .	10 „
Кудзелька—Каноплі і іх вартасьць .	8 „
Цычкоў—На дапамогу каляктыўнаму будаўніцтву	18 „
Иванов – Возделывание картофеля .	7 „
Железняк—От сохи к тракторной вспашке	5 „
Зубрилин—Лен	12 „
Яковлев— За колхозы	
Киндеев—Как перейти к коллективному хозяйству.	10 „
Кравченко—Почему крестьянам выгодно итти в колхозы	8 „

ЗА ГЭТЫМІ КНІГАМІ ЗВАРОЧВАЙЦЕСЯ Ў МЯСЦОВЫЯ СПАЖЫВЕЦКІЯ ТАВАРЫСТВЫ.



Аграномы-жанчыны зьбіраюцца ехаць на вёску для удзелу ў пасеўкампаніі.

Сялянкі! Выконвайце парады агранома—хутчэй даможацеся ўздыму гаспадаркі.

БИЧ ЧЕЛОВЕЧЕСТВА—СИФИЛИС.

В Венерологический Диспансер пришла старушка, на вид ей можно было дать лет 55—57, она вся дрожала; неопытная, не знала, куда ей обратиться. Ей было стыдно. Ей казалось, что все знают про ее несчастье, про ее горе. Медицинская сестра Диспансера направила ее в соответствующую ожидальную комнату, сообщила врачу, что ожидает больная, которую, по ее мнению, следовало-бы принять вне очереди. Врач попросил женщину в кабинет. Очутившись в кабинете, Марья, несмотря на желтый цвет лица, вся порозовела,—произнесла невнятным тихим гососом, что больна „женской болезнью". На предложение врача рассказать подробнее, когда, где и от кого она заболела, наша больная в слезах рассказала следующее: с раннего возраста, оставшись сиротой, она вынуждена была служить в няньках у людей; сначала она жила в деревне, а вот уж два года, как она живет в городе, служа нянькой к двухлетнему ребенку.

Однажды хозяева ушли из дому, к ней пришел кум из деревни, у которого жена померла год тому назад, принес с собой бутылочку самогонки. Кум начал ее угощать, выпила она несколько рюмок и не помнит дальше, как с ней произошел



Ребёнок с наследственным сифилисом.

„грех", было это двадцать дней тому назад. Три дня уже как она заметила прыщик на большой срамной губе, но все не решалась рассказать об этом кому-либо, вчера же она сообщила хозяйке, что у няе прищик. Та ее отправила в амбулаторию, последняя посоветовала обратиться сюда, в Диспансер. При осмотре врач увидел на большой срамной губе незначительный „прыщик", оказавшийся при ощупывании твердым, величиной в серебрянный гривенник, совершенно безболезненный. В правом паху железы оказались плотными, увеличенными и безболезненными. По сроку от полового сношения до заболевания—17 дней. По характеру язвочки и увеличению паховой железы врачу стало ясно, что у нашей больной свежий сифилис.

О венерических болезнях нашей Марии ничего не было известно. Врач успокоил ее и рассказал про сущность этого заболевания.—„Эта болезнь, которой вы заболели, называется сифилисом или, как в деревнях ее называют, „дурной болезнью". Болезнь довольно распространенная, не только у нас, но и заграницей. Во Франции на каждые 100 человек приходится не менее 10 человек больных сифилисом; в Берлине—столице Германии, на каждые 100 мужчин—20 больных сифилисом. У нас в Советском Союзе есть губернии, как Тамбовская, Самарская, Саратовская, Пензенская и Воронежская, в которых на каждые 100 человек имеем 15 и более больных сифилисом. Есть отдельные села в этих губерниях, где все население поголовно, от грудных детей до дряхлых стариков, заражено дурной болезнью.

Сифилис—болезнь заразная. Как и все заразные болезни, она происходит от живой заразы, т. е. от мельчайших живых существ, которые попадают в тело больного. Сифилитическая зараза слишком мала, чтобы видеть ее простым глазом; ее можно рассматривать только посредством особых, очень сильных, увеличительных стекол, увеличивающих предметы в 1000—2000 раз—микроскоп. Маленькие тельца, невидимые простым глазом, вызывающие заболевание сифилисом, называются спирохетами. Для проникновения этой заразы в наш организм достаточно маленькой трещинки кожи на каком угодно месте, и микроб может туда попасть.

Заражение сифилисом может произойти в каком угодно месте кожи и не только половым, *но и внеполовым путем.* Недавно в наш Диспансер пришел на прием крестьянин лет 50 из деревни О., Минского округа. При осмотре оказалось, что он болен сифилисом, при чем „прыщик" сидел у него на нижней губе. Крестьянин сказал, что с бабой его и детьми также не совсем ладно. Мною было предложено приехать всей семье для осмотра в Диспансер. Через несколько дней вся семья, состоящая из старика, старухи, дочери—Нади лет 18, сына—Михаила 16 лет, сына—Алексея 28 лет с женой Дарьей—прибыли в Диспансер. После осмотра выяснилось, что все больны сифилисом, причем заражение произошло внеполовым путем, за исключением Алексея, у последнего следующим образом. Старший сын Алексей год тому назад уехал на заработки в город. За два месяца до от'езда в деревню, он в компании товарищей и, будучи в стадии опьянения, попал в об'ятия „гуляющей девки" (приститутки), от которой он и заразился. Не принимая лечения в городе, он поехал в деревню, домой и, будучи в заразном периоде, целовался с родными, ел с ними одной ложкой, пил одной кружкой, утирался одним полотенцем и передал сифилитическую заразу своим родным. Были случаи заряжения у нас внеп оловым путем и после совершения религиозных обрядов, как причастие, христосование, целование икон, когда до тебя целуют больные сифилисом, а затем ты целуешь, зараза сифилитика остается на предмете, который ты целуешь, и попадает тебе через слизистую оболочку рта.

Видели мы и одного еврейского мальчика 2 месяцев, над которым совершили обряд обрезания. Раввин, который отсасывал кровь, оказался больным сифилисом, и заразил ребенка, у него на месте обреза образовался через 17 дней после обрезания сифилитический прыщ. Много еще и других разных больных было у нас, которые заразились внеполовым путем.

Врач **А. Н. Шапиро.**

Выдавец—**Аддзел работніц і сялянак ЦК КП(б)Б.** *Рэдактары* { **С. Крэмер.** **М. Меерзон.**

Шкоднікам, бюракратам і іншым сартом быдла Рэшата вельмі абрыдла. Але ім дагаджаць я ня зьбіраюся. Атрымаўшы з куткоў Беларусі многа позваў, я надзела кажух, рукавіцы, і з рэшатам напагатове вышла ў абход аднэй раніцай.

Холад Маразішчаўскі загнаў мяне ў дэлегацкі сход Буды-Люшаўскі. Дэлегаткамі там аж 30 жанок. І як толькі на сходзе аб дапамозе беднаце зачэпяць пытаньне, то пачынаюцца спрэчкі, гвалтаваньне. Амаль да бойкі даходзіць справа, бо сярод дэлегатак ёсьць кулачак арава, якім дапамога беднаце ня цікава.

А такім і ў дэлегатках не павінна быць месца. Каб наладзіць для працы згоду, зграбла я ў рэшата кулачак Буда-Люшаўскага дэлегацкага сходу.

А сама далей у абход. Наткнулася на будынак мураваны, жалезам пераплеценым вакном. На сьцяне напісана: „Папраўчы дом“. Мне зрабілася неяк маркотна, бо людзей ня відаць. Пасьля бачу такі малюнак: кулачок Барыс Шчурык — былы працаўнік Людзяневіцкай сельска - гаспадарчай каапэрацыі цягне лейцамі жарабца здараваннага. Конь упіраецца колькі сілы хапае. Я ў Шчура пытаю:

— Куды ты цягнеш жывёліну сілком?

— Ці-ж ня бачыш,—адказвае ён,—у папраўчы дом. Няхай адседзіць разам і жарэбчык; яго я набыў за грошы людзкія—каапэратыўныя, якія разам з кулацкаю хэўраю расьцягалі мы актыўна. А зараз паплаціўся адсідкай.

Стала мне брыдка гаворка з растратчыкам. Думаю вось што: зазірну ў Жыткавіцкую пошту. Трэба прыглядзецца зранку, як там распаўсюджваюць „Белрабсялянку“.

Зашла. Пазіраю. Вакенца малое, а ў ім галава. Адкуль мне ведаць, ёсьць у галаве гэтай розум ці няма. З гэтым знаёмы дахтары бальніцы. Бачу—сялянка прышла, і ў вакенца—тыц.

— Можна падпісацца на „Белрабсялянку“?—пытае.

Паштавік адказвае:

— Можна, то можна, толькі кошту яе я ня знаю. Вы плаціце 35 капеек за месяц, а калі лішка будзе, то ў рэдакцыі людзі зьвярнуць вам лішку.

Цётцы аж млосна стала ад такога адказу лоўкага, бо на сходзе яна чула, што часопісь за месяц каштуе адну залатоўку.

А я тым часам за паштавіка з вакенца ды ў рэшата. Хай вытрусіць з галавы глупства. Калі сам ня ведае, хай людзям ня брэша—галаву ня муціць.

З Мазыршчыны я махнула аж у Селішча, Віцебскай акругі. Рэшатам я надарвалася моцна, бо прышлося да акушоркі зьвярнуцца. У акушоркі сялянка гарная пытае:

— Колькі месяцаў я цяжарная?

Зацікавіла гэта і мяне. Я любуюся цёткай бяз спросу, а ў яе пуза—вышэй носу.

У акушоркі-ж замест вачэй, мабыць, бляшкі сьвецяць, бо сялянцы яна адказала:

— У вас цяжарнасьць на другім толькі месяцы.

Гэтым яна бедную цётку так напалохала, што тая аж заохала.

— Ай, ай — добрыя людзі! Што-ж гэта са мною яшчэ праз 7 месяцаў будзе, калі радзіць прыдзе пара. Я-ж і зараз нібы гара.

Галосіць цётка. А я хоць сьвежы чалавек, а стала мне яе шкода. Закінула я ў рэшата акушорку сьляпога роду.

На шляху зваротным да Менску зашла я ў вёску пагрэцца, якая Лошніцай завецца.



Ёсьць там і хата-чыталка, а насьценгазэты 4 месяцы цю-цю. У хатніка адмоўка—шэфы малююць загаловак.

О го-го-о, шэфы—адгукніцеся. Калі хатнік сьпіць, вы яго пабудзіце.

223
929.10.26

ПАРАДЫ ГАСПАДЫНЯМ.

Водоупорная замазка для корыт, желобов и полок.

Берут нужное количество гашенной извести, просеянной через частое сито, и замешивают ее на рыбьем жиру, до густоты хорошо разделаного теста или замазки, и замазывают ею все щели в указанных предметах.

Як памякчыць абветраныя рукі.

Ад хатняй працы, асабліва ўзімку, рукі робяцца вельмі шорсткія, часьцяком рукі нават трэскаюцца і ад гэтага баляць.

Каб ад гэтага пазбавіцца, патрэбна штодзённа, пасьля работы, мыць рукі цёплай вадою з мылам і пасьля мазаць рукі гліцарынаю. Ад гэтага трэшчыны гояцца.

Як мыць лінючае адзеньне.

Рознакаляровае адзеньне ня мочаць перад мыцьцём, як гэта робяць з белаю бялізнаю, не дадаюць да вады соды, не заліваюць гарачай вадою. А трэба ла вады дадаць солі і шпарка мыць. Паласкаць трэба дадаўшы ў ваду воцату, бо воцат не дае расплывацца ў хварбе. Добра выпаласкаўшы рэч, сушаць яе ўхаладку а не на сонцы, бо ад сонца хварба таксама ліняе. Прасаваць трэба тады, калі рэч яшчэ вільготная.

Калі мыць рабую тканіну, ня можна складаць яе адна на адну, бо каляровы малюнак можа паплямiць тканіну.

Чтобы ламповое стекло не лопалось.

Чтобы ламповое стекло не ло[illegible]лось, нужно завернуть его в [illegible]олому, положить в посудину, [illegible]ить холодной водой и поки[illegible]ить минут десять. Сняв посу[illegible] с огня, не следует сразу вы[illegible]мать из воды стекло до тех пор, пока оно в воде не остынет. Тогда вынуть его, снять солому, насухо вытереть, от этого ламповое стекло становится крепким.

Также можно закалить стаканы.

Чыгуны і жалезны пасудак.

Каб чыгуны і жалезны пасудак не іржавелі і не псаваліся, трэба іх трымаць у сухім месцы. Калі-ж такі посудак доўга стаіць без карыстаньня і пакрыецца іржою, то пазбавіцца ад гэтага можна такім чынам.

Чыгунную патэльню ці казан ставяць на жар, насыпаўшы туды солі. Калі гэта добра выжарыцца, з вагню зьнімаюць і шаруюць гарачым і тою-ж перагарэлай сольлю. Пасьля гэтага посудак робіцца як новы.

Очистка самовара от накипи.

В местностях с жесткой водой на самоварах и чайниках обычно очень быстро наростает накипь. От этого самовары плохо нагреваются и могут даже распаяться, не говоря уже о том, что накипь засоряет краны и носики и вода течет очень медленно. Не отдавая самовара лудильщику, можно домашним путем избавиться от накипи. Для этого время от времени (раз в 2—3 недели) надо вскипятить в самоваре воду с льняным семенем. Даже при сильно запущенной накипи через час отваливается большая часть накипи; если-же самовар недавно полужен, то на нем вовсе не образуется накипь.

На каждые десять стаканов воды, входящей в самовар, надо брать сто грамм льняного семени.

Об'яснение к выкройке детского платья от шести до восьми лет.

Платье можно шить с любой материи. Если материал в рисунках, то очень хорошо отделать гладким материалом.

Чертеж платья для девочки 6-8 л.

Кроить платьице по фасону, указанному на картинке, нужно так. Материал разложить на гладком столе, сложив его продольно, посередине отложить наметку для того, чтобы крой получился правильный. Выкройку нужно раньше примерит ребенку по фигуре, а потом разложить выкройку по материялу так, чтобы середина зада выкройки точно совпадала с продольной частью материи, где проложена нитка, тоже самое и середина передка.

Спереди на платье встречные складки заканчиваются патой в виде кармашек. Для застежки спереди от ворота делается небольшой надрез и аккуратно подшивается другой материей. Спинка платья кроится без шва—цельная. (Разложивши материал для кройки на стол, нужно приложить сразу и выкройку спинки и передка и рукавов для того, чтобы экономнее кроить). Платье следует кроить немного длиннее для того, чтобы можно было сделать более широкую подшивку, так как дети растут быстро, а сделать сразу платье длинное некрасиво и неудобно. Воротник нужно кроить двойной, иначе он будет плохо лежать. Пояс и манжеты также кроить из двойной материи. При составлении платьица в боковых швах зубчики должны совпадать.

Материала на такое платьице нужно 2¼ метра и для отделки ¼ метра.

Работніцы і сялянкі, пішэце, якія выкрайкі вам пажадана мець.

Друкарня БДВ. Зак. № 1911—12000. Галоўлітбел 1059.